# ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ СУПРАЦОЎНІЦТВА

## VII Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі плануецца правесці ў верасні

У Мінску прайшло пасяджэнне беларускай часткі аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні VII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. Мерапрыемства адбудзецца ў Мінску і Мінскай вобласці і збярэ каля 500 удзельнікаў. Пра гэта паведаміў намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Анатоль Ісачанка.

На думку віцэ-спікера верхняй палаты беларускага Парламента, за апошнія гады Форум зарэкамендаваў сябе добрай дыскусійнай пляцоўкай, дзе сустракаюцца парламентарыі, губернатары, бізнес-супольнасць:

— У рамках Форуму праходзяць пасяджэнні секцый на розную тэматыку: сельская гаспадарка, будаўніцтва, прамысловасць. Таксама на палях гэтага мерапрыемства пройдзе маладзёжны форум, адбудзецца Савет дзелавога супрацоўніцтва, плануецца падпісанне пагадненняў аб супрацоўніцтве паміж рэгіёнамі, заключэнне камерцыйных кантрактаў. Але асаблівасць Форуму гэтага года — тэма нашай агульнай Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Секцыю, прысвечаную захаванню гістарычнай спадчыны і ўмацаванню адзінства брацкіх народаў, мяркуецца правесці на базе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Сумесныя праекты як фактар стабільнага эканамічнага развіцця Беларусі і Расіі абмяркуюць у Жодзіне на тэрыторыі БелАЗа. Секцыя «Подзвіг савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне — аснова выхавання патрыятызму і грамадзянскай адказнасці» пройдзе на базе Нацыянальнай акадэміі навук. Удзельнікаў секцыі на тэму «Стварэнне ўмоў для павышэння сацыяльна-эканамічнай актыўнасці моладзі ў мэтах устойлівага развіцця рэгіёнаў Беларусі і Расіі» прыме ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі». Яшчэ адна секцыя, прысвечаная супрацьдзеянню гераізацыі нацызму на міжнародных пляцоўках, пройдзе на базе Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Пленарнае пасяджэнне Форуму рэгіёнаў адбудзецца ў кангрэс-холе «Мінск» сталічнага «Прэзідэнт-Гатэля».

Максім **Осіпаў**

SB.BY



Анатоль Ісачанка і старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец